# Асаблівасці прамысловага развіцця Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гады

УДК 94 (476) «1921/1939»



**Ларыса ЛАЎРЭЕНКА, кандыдат гістарычных навук**

Ларыса ЛАЎРЭЕНКА. Асаблівасці прамысловага развіцця Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гады. Аўтар на аснове вялікай колькасці розных гістарычных крыніц характарызуе прамысловае развіццё Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гады, раскрывае яго ролю ў эканамічным жыцці заходнебеларускіх земель і Польшчы ў цэлым. Разглядае эканамічнае становішча Польскай дзяржавы ў вызначаны перыяд. На падставе багатага фактычнага матэрыялу паказвае развіццё асноўных галін заходнебеларускай прамысловасці ў 1921–1939 гады, асаблівасці іх дзейнасці.
Ключавыя словы: Заходняя Беларусь, эканоміка, прамысловасць, прамысловае развіццё, галіна прамысловасці.

Larysa LAUREYENKA. Industrial development of Western Belarus in 1921–1939. Based on the analysis of a large number of different historical sources, the author gives the characteristics of the industrial development of Western Belarus in 1921-1939, and describes its role in the economic life of western Belarusian lands and Poland as a whole. The article examines the economic development of the Polish state in the given period. The author cites numerous facts to illustrate the development of major branches of industry in Western Belarus in 1921-1939 and describes the specifics of their operation at that time.
Keywords: Western Belarus, economy, industry, industrial development, major industries.

Польская дзяржава ў 1920-я гады была аграрна-індустрыяльнай, эканамічна адсталай краінай. Эканоміка Польшчы вызначалася рознымі ўзроўнямі развіцця асобных рэгіёнаў. Найбольш развітымі землямі былі Верхняя Сілезія (самы буйны раён горназдабываючай і цяжкай прамысловасці), Познаньшчына і Памор'е. Прамысловасць Польшчы складалася ў асноўным з нафтапромыслаў Прыкарпацця, а таксама невялікіх прадпрыемстваў Львова і Кракава *[1, с. 25]*. Далучаныя да яе заходнебеларускія землі былі найбольш адсталымі – прамысловасць на іх была прадстаўлена дробнымі прадпрыемствамі і рамяством. Адной з галоўных прычын такога становішча быў аграрны характар заходнебеларускай эканомікі. Увогуле, па ўзроўні прамысловай вытворчасці Польская дзяржава ў два разы адставала ад сярэдніх сусветных паказчыкаў вытворчасці прамысловай прадукцыі на душу насельніцтва, уключаючы адсталыя і каланіяльныя краіны, а колькасць занятых у прамысловасці рабочых складала толькі 10,3 % насельніцтва *[2, s. 10]*.

У 1921–1939 гады істотна змяніліся знешнія ўмовы развіцця польскай эканомікі. У выніку ўзмацнення канкурэнтнай барацьбы большасць эканамічных сувязяў з землямі былой Аўстра-Венгрыі і Германіяй, якая аб'явіла Польшчы мытную вайну, былі разарваныя. Па палітычных матывах амаль цалкам быў страчаны рынак былой Расійскай імперыі (напрыклад, у 1938 годзе доля СССР у знешнім гандлі Польшчы складала 0,5 %). Гэтыя абставіны значна абмяжоўвалі магчымасці тых галін польскай эканомікі, якія былі арыентаваны на экспарт. Трэба яшчэ дадаць і вузкасць унутранага рынку, што вынікала з аграрнага характару рэгіёна, і складанасць працэсу фарміравання адзінага гаспадарчага механізму краіны з

## ПРА АЎТАРА

ЛАЎРЭЕНКА Ларыса Віктараўна.

Нарадзілася ў г. Брагіне Гомельскай вобласці. Скончыла гістарычны (2009) і юрыдычны (2018) факультэты Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта (БрДУ) імя А.С. Пушкіна.

З 2009 па 2016 год працавала выкладчыкам кафедры педагогікі БрДУ імя А.С. Пушкіна. З 2016 года – настаўнік гісторыі і грамадазнаўства сярэдняй школы ў в. Скокі Брэсцкага раёна.

Кандыдат гістарычных навук (2021).

Аўтар 52 навуковых публікацый, у тым ліку дзвюх калектыўных манаграфій, аднаго навукова-папулярнага выдання (у суаўтарстве).

Сфера навуковых інтарэсаў: гісторыя Заходняй Беларусі 1921–1939 гадоў, гісторыя паўсядзённасці, гістарычнае краязнаўства.

эканомікі тэрыторый, якія ў свой час уваходзілі ў склад розных дзяржаў. Усе гэтыя ўмовы вызначалі нераўнамернасць і цыклічнасць развіцця як заходнебеларускай, так і ўсёй польскай эканомікі ў цэлым. На змену перыядам уздыму прыходзілі перыяды спаду, дэпрэсіі і крызісу *[3, с. 229]*.

З 1920-х гадоў у Польскай дзяржаве пачынаецца працэс аднаўлення і развіцця формаў эканамічнага жыцця. На першы план выступіла неабходнасць аднаўлення разбуранай прамысловасці. З гэтай мэтай урад пачаў сваю дзейнасць у наступных кірунках:

– фінансавая дапамога, якая прадстаўлялася ў форме пазыкі;
– садзейнічанне ў прывозе сыравіны і тэхнічных тавараў;
– падтрымка распрацоўкі і ўдасканалення прамысловага заканадаўства і г. д. *[4, s. 4]*.

Такім чынам, у прамысловасці, як і ва ўсёй польскай эканоміцы, пачаўся перыяд (з 1921 па 1923 год) паступовага ўздыму, што было звязана з пасляваенным аднаўленнем і попытам на спажывецкія тавары ва ўмовах інфляцыйнай кан'юнктуры. Але ўжо з 1923 года ў эканоміцы Польшчы наступіў структурны крызіс, які цягнуўся аж да вясны 1926 года. Пасля пачалося ажыўленне ў эканамічным жыцці, якое было звязана са стабілізацыяй сусветнай гаспадаркі і паляпшэннем экспартнай сітуацыі *[1, с. 25]*. А ў канцы 1929 года пачаўся небывалы па сваёй глыбіні сусветны эканамічны крызіс.

Важнай асаблівасцю польскай прамысловасці 1920–1930-х гадоў была наяўнасць замежнага манапалістычнага капіталу (нямецкага, французскага, бельгійскага і часткова англійскага). У руках прадпрымальнікаў заходнееўрапейскіх краін знаходзіліся найбольш развітыя галіны польскай прамысловасці: нафтавая, у якой замежны капітал складаў 85 %, металургічная – 66,8 %, хімічная – 49,2 % *[5, с. 35]*. У 1921 годзе ў Польшчы налічвалася 13 манапалістычных аб'яднанняў, на 1 студзеня 1929 года іх было ўжо 100, на 1 студзеня 1934 года – 233, на 1 студзеня 1936 года – 274 *[6, с. 4]*.

У 1921–1939 гады эканоміка Заходняй Беларусі, як адзначалася вышэй, была пераважна аграрнай. Разам з неспрыяльнай для ўсёй польскай эканомікі знешняй і ўнутранай кан'юнктурай гэта абумовіла вельмі павольныя тэмпы яе развіцця, нізкі ўзровень жыцця большай часткі мясцовага насельніцтва, на якім адбіліся негатыўныя наступствы Першай сусветнай вайны. Больш за тое, пасляваенныя межы «адрывалі» заходніх беларусаў ад былога агульнарасійскага рынку. Польскія ўлады не ўкладвалі сродкі ў слабаразвітую прамысловасць Заходняй Беларусі, бо аддавалі перавагу цэнтральным і заходнім рэгіёнам краіны, дзе існавалі лепшыя ўмовы – развітая інфраструктура, наяўнасць грашовых сродкаў, блізкасць да ўнутраных рынкаў.

Вядучымі галінамі заходнебеларускай прамысловасці з'яўляліся лясная, харчовая, мінеральная і тэкстыльная. На тэрыторыі Заходняй Беларусі не было цяжкай прамысловасці і амаль поўнасцю адсутнічалі буйныя вытворчасці: у 1938 годзе яны складалі 0,5 %, сярэднія – 9,4 %, дробныя – 90,1 % ад усіх прадпрыемстваў чатырох ваяводстваў *[7, с. 5]*. Найбольш прамыслова развітым было Беластоцкае ваяводства. Амаль аднолькавая колькасць сярэдніх і буйных прадпрыемстваў налічвалася ў Віленскім і Палескім ваяводствах. Найменш развітай была прамысловасць у Навагрудскім ваяводстве. Сярэднія і буйныя прадпрыемствы Беластоцкага ваяводства размяшчаліся ў дрэваапрацоўчай, тэкстыльнай, мінеральнай, гарбарнай і металаапрацоўчай галінах; Віленскага – у дрэваапрацоўчай, папяровай, паліграфічнай, мінеральнай і гарбарнай; Навагрудскага – у дрэваапрацоўчай і мінеральнай; Палескага – у асноўным у дрэваапрацоўчай галіне.

Найбольш буйной і прыбытковай з усіх галін прамысловасці на тэрыторыі Заходняй Беларусі была лясная (лесанарыхтоўчая, лесапільная, фанерная і запалкавая галіны), якая залежала ад знешніх рынкаў, арыентавалася выключна на экспарт і развівалася на мясцовай сыравіне. Менавіта ў лясную прамысловасць укладвалі свой капітал замежныя і польскія манаполіі (акцыянернае таварыства Swierk, англійская акцыянерная кампанія Continent, англійская фірма Gips Timber Forest compani, таварыства «Бобрык» і інш.) *[8, арк. 4 адв; 9, с. 62]*.

Уляснoй прамысловасці найбольшае развіццё атрымала дрэваапрацоўчая галіна, якая аб'ядноўвала лесанарыхтоўчую і лесапільную дзейнасць. Асноўнымі прадуктамі лесанарыхтоўчай галіны з'яўлялася драўлянае бярвенне, тэлеграфныя і тэлефонныя слупы, рудніковая стойка і балансы для вытворчасці драўлянай масы і цэлюлозы. На лесанарыхтоўчых прадпрыемствах працавалі пераважна сельскагаспадарчыя сезонныя рабочыя. Лесапільная прамысловасць Заходняй Беларусі займалася вырабам піламатэрыялаў, дошак, паўфабрыкатаў *[10, с. 12]*.

У параўнанні з 1913 годам колькасць прадпрыемстваў і іх рабочых у лясной прамысловасці ў 1931 годзе павялічылася больш чым у 2 разы. Па колькасных і якасных паказчыках на першым месцы ў лесапільнай вытворчасці знаходзілася Беластоцкае ваяводства (з 348 лесапільных заводаў Заходняй Беларусі тут было 109, сярод іх 2 найбольш буйныя з колькасцю рабочых ад 200 да 500).



**Лодкі з дрэвам на р. Піне. 1938 год. Фота Яна Булгака**

Заходняя Беларусь з'яўлялася галоўным пастаўшчыком таннай неапрацаванай драўніны за мяжу (каля 80 % агульнапольскага экспарту лесаматэрыялаў). Развіццё атрымала фанерная галіна з найбольшай ступенню канцэнтрацыі вытворчасці і тэхнічна самая складаная. Яна не толькі не скараціла сваю вытворчасць, а наадварот, значна павялічыла ў параўнанні з перыядам да Першай сусветнай вайны. Клееная фанера з'яўлялася важным паўфабрыкатам не толькі для мэблевай прамысловасці і вырабу скрынь, але і для вытворчасці аэрапланаў і аўтамабіляў, таму карысталася попытам на знешніх рынках. У 1929 годзе ў Польшчы налічвалася 20 фанерных фабрык, з іх 10 у Заходняй Беларусі, у 1932 годзе іх ужо было 32 і 13 адпаведна *[10, с. 25]*. У 1934 годзе ў Польшчы працавалі 33 фанерныя фабрыкі *[11, s. 77]*. Фанера з Заходняй Беларусі складала больш за палову агульнапольскага аб'ёму яе вытворчасці. Каля 85 % выробленай у Заходняй Беларусі фанеры экспартавалася за мяжу, галоўным чынам у Германію (19,1 %), Англію (17,8 %) і Галандыю (16,9 %) *[12, s. 59; 13, s. 23]*. Спажыўцамі заходнебеларускай фанеры з'яўляліся таксама Бельгія, Швейцарыя, Аргенціна, Аўстрыя, Данія, Грэцыя, Францыя, Егіпет, Чэхаславакія, Югаславія і іншыя краіны *[14, s. 45]*. Асноўная частка экспарту фанеры знаходзілася ў руках нямецкіх прадпрыемстваў. Найбольш вядомыя фабрыкі па вытворчасці фанеры знаходзіліся ў Беластоку, Гродне, Мастах, Семятычах (Беластоцкае ваяводства), Шчучыне (Навагрудскае ваяводства), Пінску, Мікашэвічах, Маларыце (Палескае ваяводства).

Экспарт алешыны, асноўнай сыравіны запалкавай прамысловасці, з тэрыторыі Заходняй Беларусі складаў 90 % ад агульнапольскага экспарту, таму запалкавая галіна не атрымала развіцця ў адрозненне ад дрэваапрацоўчай і фанернай. Тым больш што пасля ўвядзення запалкавай манаполіі (1925) пяць запалкавых фабрык у Заходняй Беларусі былі зачынены. Сярод іх дзве фабрыкі ў Вільні, фабрыка запалак у Лідзе, Беластоку і Слоніме. Працягвалі функцыянаваць толькі дзве: фабрыка Maries у Гродне і Progres-Wulkan у Пінску *[10, с. 29; 15, арк. 81 адв.]*.

Нягледзячы на значны экспарт целюлознай драўніны, папяровая прамысловасць не развівалася і на тэрыторыі Заходняй Беларусі была прадстаўлена ўсяго толькі васьмю фабрыкамі паперы і кардону. Найбольш буйной і вядомай з іх была фабрыка ў Альбярціне Слонімскага павета. Неабходна адзначыць, што яна ў 1928 годзе пачала выпускаць глянцавы кардон, важным спажыўцом якога з'яўлялася Дзяржаўная тытунёвая манаполія, якая дагэтуль большую частку сваіх закупаў ажыццяўляла ў Фінляндыі пры дапамозе гандлёвых пасрэднікаў *[15, арк. 247 адв]*. Увогуле, прадукцыя існуючых фабрык паперы і кардону была нізкай якасці і не магла ўступіць у належную канкурэнцыю не толькі з замежнымі таварамі падобнага тыпу, але і з польскімі. Таму ўся прадукцыя папяровай прамысловасці была накіравана толькі на ўнутраны рынак.

Хімічная прамысловасць (сухая перагонка іглічных парод (смолакурэнне) – вытворчасць смалы; сухая перагонка лісцевых парод – вытворчасць воцатнай кіслаты і інш., вытворчасць шкіпінару з жывіцы хвоі; вытворчасць лакаў і фарбаў; вытворчасць ільнянога алею, мыла і свечак) на заходнебеларускіх землях была прадстаўлена 576 прадпрыемствамі. Аднак толькі 11 з іх можна аднесці да прамысловых у прамым сэнсе гэтага слова, астатнія былі саматужнымі *[10, с. 42]*. Найбольш буйныя цэнтры лесахімічнай прамысловасці знаходзіліся на тэрыторыі Беластоцкага ваяводства. Вядомыя прадпрыемствы – фабрыка сухой перагонкі дрэва і шкіпінарны завод Grodzisk (мястэчка Гайнаўка Бельскага павета), фабрыка гумавай прамысловасці Ardal, фабрыка Unigum, Korona ў Лідзе, фабрыка гумавай ленты ў мястэчку Граева Беластоцкага ваяводства. Акрамя гэтага, на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1920–1930-я гады дзейнічала 40 мылаварняў, з іх 14 размяшчаліся ў Вільні, самым буйным у Заходняй Беларусі цэнтры мылаварэння. Другое месца займаў Беласток з пяццю мылаварнямі. Затым ішлі Ліда, Аўгустоў, Слонім, Навагрудак, Баранавічы, у якіх знаходзілася па адной мылаварні *[10, с. 45]*. Усе гэтыя прадпрыемствы былі прымітыўнымі, саматужнага тыпу. 80 % з іх выраблялі толькі мыла

для мыцця, дзве мылаварні выпускалі яшчэ і туалетнае мыла. 20 % з іх рабілі таксама свечкі і соду для мыцця бялізны. Прадукцыя найбольш буйных мылаварняў даходзіла да 250 тыс. кілаграмаў у год. Колькасць рабочых была невялікая, разам з сем'ямі прадпрымальнікаў складала ўсяго 150 чалавек. Выпрабленая прадукцыя ішла выключна на ўнутраны агульнапольскі рынак, дзе сутыкалася з моцнай канкурэнцыяй з боку варшаўскіх фабрык *[10, с. 45; 16, s. 174]*.

Тэкстыльная прамысловасць размяшчалася галоўным чынам у Беластоку і яго ваколіцах (Супрасль, Васількава, Грудок, Міхалёва і інш.). Невялікая колькасць прадпрыемстваў тэкстыльнай прамысловасці знаходзілася і ў Вільні. Толькі некаторыя з іх можна аднесці да прамысловасці ў поўным сэнсе гэтага слова. Так, з 463 ткацкіх прадпрыемстваў каля 400 былі саматужнага тыпу, 34 – буйныя, астатнія – сярэднія. Трыкатажных і панчошных майстэрань на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1932 годзе налічвалася 67 (56 з іх – VIII катэгорыі). Адзіны завод, які меў IV прамысловую катэгорыю, знаходзіўся ў Вільні. Там размяшчаліся і адзіныя ў Заходняй Беларусі трыкатажныя прадпрыемствы VI катэгорыі *[10, с. 67]*. Асноўнымі спажыўцамі прадукцыі тэкстыльнай галіны Заходняй Беларусі былі Кітай, Румынія, Англія, Галандыя, Брытанская Індыя, краіны Паўднёвай і Паўночнай Афрыкі, Манчжурыя, Нарвегія, Палесціна, Персія і Сірыя. Галоўным канкурэнтам у гэты перыяд на міжнародным рынку для заходнебеларускіх тканін быў СССР. Туды ішлі таксама заходнебеларускія льняныя і ваўняныя тканіны, коўдры, гатовае адзенне.

Значная роля ў прамысловым развіцці Заходняй Беларусі адводзілася харчовай прамысловасці, якая па колькасці прадпрыемстваў займала першае месца, але тэхнічна была самай адсталай галіной. У 1930 годзе на заходнебеларускіх землях налічвалася 3590 такіх прадпрыемстваў, у 1931 годзе іх было 3557, у 1932-м – 3403 *[10, с. 83]*. Змяншэнне прадпрыемстваў харчовай прамысловасці было звязана з тым, што яна працавала выключна на задавальненне патрэб унутранага рынку, прадукцыя не ішла на экспарт. Найбольш прыбытковай была вытворчасць спіртных напояў, аднак на заходнебеларускіх землях яна не атрымала значнага развіцця, бо на тэрыторыі Польскай дзяржавы існавала спіртавая манаполія, якая вызначала аб'ём выпускаемай прадукцыі і цэны на яе. У 1929 годзе на тэрыторыі Заходняй Беларусі налічваўся 21 броварны завод, што складала 11,5 % ад агульнай колькасці такіх заводаў ва ўсёй Польскай дзяржаве.

Заходняя Беларусь мела значную колькасць дробных маслабойных прадпрыемстваў (напрыклад, у 1929 годзе іх было 266), якія размяшчаліся амаль у кожным мястэчку. Гэтыя прадпрыемствы былі вельмі прымітыўнымі і толькі невялікую іх колькасць можна аднесці да прамысловых. Алейні знаходзіліся пераважна ў Віленскім (Вільня і Варапаева) і Беластоцкім ваяводстве (Беласток і Сувалкі). Колькасць працоўных у кожным з пералічаных заводаў у 1929 годзе складала ад 30 да 50 чалавек. З усіх прадпрыемстваў толькі сем ужывалі машынны і хімічны спосаб экстрагавання, а не толькі прымітыўны спосаб прасавання. Найбольш буйным у Заходняй Беларусі з'яўлялася акцыянернае таварыства Курляндскай алейні ў Вільні. Там працавала каля 100 чалавек, асноўны капітал складаў 1 млн злотых. Яшчэ адным вядомым прадпрыемствам Вільні можна назваць завод J. Trocki і К°. Прадуктамі маслабойных заводаў у першую чаргу з'яўляліся льняное насенне і жмых, 90 % якіх экспартаваліся галоўным чынам у Германію, Чэхаславакію і Аўстрыю *[17, арк. 10; 18, арк. 11]*.

Мукамольная вытворчасць і млынарства займалі важнае месца ў эканамічным жыцці насельніцтва Заходняй Беларусі. Амаль у кожным мястэчку знаходзілася па некалькі млыноў. Так, напрыклад, у некаторых мястэчках Палескага ваяводства размяшчалася ад пяці да дзевяці млыноў. Прааналізаваўшы штогадовыя справаздачы польскіх улад, прамыслова-гандлёвай палаты і іншыя матэрыялы, неабходна адзначыць, што па сваіх функцыях млыны падзяляліся на гандлёвыя і гаспадарчыя, а таксама на механічныя, электрычныя, паравыя, ветраныя (ветракі) і газавыя. Уласнікамі водных і ветраных млыноў былі ў асноўным памешчыкі, паравых, газавых і электрычных – яўрэі, польскія і замежныя фірмы. Водныя і ветраныя млыны дзейнічалі як асобныя прадпрыемствы. Паравыя і электрычныя – разам з электрастанцыямі, лесапілкамі і іншымі прамысловымі прадпрыемствамі. На тэрыторыі Палескага ваяводства ў 1925 годзе дзейнічала 258 паравых, 64 водныя і 36 ветраных млыноў *[19, арк. 14; 10, с. 95–96]*.

Мінеральная галіна па колькасці прадпрыемстваў на тэрыторыі Заходняй Беларусі займала трэцяе месца (пасля лясной і харчовай). Адзіная на заходнебеларускіх землях фабрыка, якая вырабляла шкляны посуд, галантарэйныя шкляныя вырабы, а таксама шкляныя ізалятары, знаходзілася ў мястэчку Нёман каля Ліды. Адзіны цэментавы завод на тэрыторыі Заходняй Беларусі знаходзіўся ў мястэчку Падрось Ваўкавыскага павета Беластоцкага ваяводства, яго прадукцыя ішла на экспарт у Літву, Латвію, Германію, Фінляндыю *[10, с. 125]*.

Цагляная прамысловасць у 1921–1939 гады прыйшла ў заняпад. Вытворчасць цэглы была цесна звязана з будаўніцтвам, якое ў даследуемы перыяд на заходнебеларускіх землях развівалася даволі слаба, бо новыя каменныя дамы фактычна не будаваліся. Акрамя гэтага, заходнебеларускія цагельні мелі прымітыўнае абсталяванне і працавалі пераважна на мясцовы

рынак. У большасці з іх вытворчасць адбывалася ручным спосабам: нешматлікія заводы мелі гофманаўскія і механічныя печы. У Віленскім ваяводстве гофманаўскіх печаў у 1929 годзе налічвалася толькі сем (у даваенны перыяд – 18) і сем цагельняў *[20, арк. 5 адв]*. На тэрыторыі Навагрудскага ваяводства ў 1928 годзе знаходзілася 53 цагельні, з якіх толькі сем мелі гофманаўскія печы *[21, s. 2]*. Вядомымі прадпрыемствамі тут былі кафлярні Tanur і Raaf (г. Ліда). На мясцовы рынак кафлярня Tanur выраблялa «квадратэльную» кафлю. На экспарт у Памор'е і Вялікапольшчу выраблялася «берлінская» (плоская і вялікая) кафля. Абарот прадпрыемства Tanur у 1936 годзе складаў каля 48 тыс. злотых. На тэрыторыі Палескага ваяводства ў Гершонах Брэсцкага павета існавала дзяржаўная цагельня, на якой працавала 167 чалавек (1924). У Віленскім ваяводстве было толькі тры цагельні I–V катэгорый, астатнія былі невялікія па памерах *[22, с. 59; 23, арк. 7]*.

Металаапрацоўчая, гарбарная, паліграфічная галіны на заходнебеларускіх землях не атрымалі значнага развіцця і былі прадстаўлены толькі невялікай колькасцю дробных прадпрыемстваў, якія працавалі пераважна на задавальненне патрэб унутранага рынку. За ўвесь час знаходжання Заходняй Беларусі ў складзе Польскай дзяржавы вытворчасць гарбарняў ні разу не дасягала даваеннага ўзроўню. Асноўным іх прадуктам была падэшвенная скура і рукавічкі, невялікая колькасць якіх ішла на экспарт у Англію, Галандыю, Паўднёва-Афрыканскі Саюз, Данію, Мексіку, Палесціну, Сірыю, Кітай, Аўстралію і Швейцарыю *[24, арк. 2; 17, арк. 10–11]*.

Металаапрацоўчая галіна складалася толькі з ліцейных фабрык жалеза, фабрык дроту і цвікоў *[25, s. 165]*. У 1922 годзе на тэрыторыі Палескага ваяводства налічвалася 18 прадпрыемстваў гэтай прамысловасці, на якіх працавалі ўсяго 145 чалавек *[26, арк. 10, 12; 27, арк. 6]*. На тэрыторыі Навагрудскага ваяводства – адна фабрыка цвікоў і тры фабрыкі сельскагаспадарчых машын. Астатнія прадпрыемствы гэтай катэгорыі адносіліся да рамяства *[28, s. 2]*. У перыяд крызісу спажыванне жалеза знізілася яшчэ больш. Прычыну гэтага прамысловыя ўлады звязвалі з нізкай сельскагаспадарчай культурай селяніна, які працягваў карыстацца прымітыўнымі прыладамі пры апрацоўцы зямлі, а таксама зніжэннем будаўнічага руху. Так, напрыклад, штогадовая вытворчасць фабрыкі дроту і цвікоў Навагрудскага ваяводства ў 1929 годзе складала 250 тон. Для параўнання, у 1928 годзе – 455 тон *[29, арк. 256 адв]*. З канца кастрычніка 1931 года праз адсутнасць збыту прадукцыі спыніла працу Fabryka drutu i gwoździ w Landwarowie Dom handlowo-przemysłowy Platyna ў Ландварове Віленска-Троцкага павета *[30, арк. 41]*.

Зменшылася і вытворчасць фабрык сельскагаспадарчых машын, якія выраблялі галоўным чынам сячкарні і прывады. Вытворчасць сячкарняў у 1931 годзе па ўсёй Заходняй Беларусі дасягнула 2573 адзінкі, а ў 1932 годзе – 498, прывадаў 479 і 140 адпаведна *[10, с. 75]*. На тэрыторыі Беластоцкага ваяводства ў 1935 годзе вырас выпуск найбольш распаўсюджаных тэкстыльных машын, г. зв. фалюш *[16, s. 180–181]*.

Паліграфічная галіна на заходнебеларускіх землях была прадстаўлена друкарнямі, літаграфіямі і адной фабрыкай па вытворчасці ігральных карт. У 1922 годзе на тэрыторыі Палескага ваяводства працавалі 10 друкарняў, у 1925 годзе – 16 *[31, арк. 16 адв]*. У Навагрудскім ваяводстве дзейнічала толькі адна сеймікавая друкарня, на якой працавалі 20 чалавек. Там выходзілі газета Życie Nowogródzkie, розныя выданні для старостваў і ваяводскага ўпраўлення *[15, арк. 248 адв]*. На тэрыторыі Віленскага ваяводства ў 1927 і 1928 гадах працавалі дзевяць друкарняў (223 і 246 работнікаў адпаведна), якія канцэнтраваліся менавіта ў Вільні. Невялікая колькасць іх прадукцыі (кнігі для набажэнства) ішла на латвійскі рынак *[32, арк. 10 адв]*.

Падводзячы вынікі, трэба адзначыць, што прамысловае развіццё Заходняй Беларусі ў перыяд яе ўваходжання ў склад Польскай дзяржавы (1921–1939) характарызавалася нераўнамернасцю свайго развіцця і сутыкалася з пэўнымі цяжкасцямі. Гэта і вялікія страты, якія панеслі заходнебеларускія землі падчас Першай сусветнай вайны. Па палітычных матывах амаль цалкам быў страчаны рынак былой Расійскай імперыі. З прычыны палітычнай нестабільнасці ў памежнай паласе Польшчы на заходнебеларускія землі прыток капіталаў быў слабым. Польскія ўлады не ўкладвалі сродкі ў слабаразвітую прамысловасць Заходняй Беларусі. Немагчыма было атрымаць як доўгатэрміновыя, так і кароткатэрміновыя крэдыты. Неспрыяльнай была і падатковая сістэма Польскай дзяржавы. Адмоўна на прамысловае развіццё ўплывалі вузкасць унутранага рынку, якая вынікала з аграрнага характару рэгіёна, складанасць працэсу фарміравання адзінага гаспадарчага механізму краіны з эканомікі тэрыторый, якія ў свой час уваходзілі ў склад розных дзяржаў, а таксама рознасць эканамічных сістэм. Пераважна аграрны характар сацыяльна-эканамічнага развіцця заходнебеларускага рэгіёна прадвызначыў нізкую ступень канцэнтрацыі прамысловай вытворчасці, нераўнамернасць яе функцыянавання. Заходнебеларуская прамысловасць у асноўным была арыентавана на пераапрацоўку мясцовай сыравіны і выпуск паўфабрыкатаў. Будаўніцтва фабрык і заводаў, чыгуначных дарог на тэрыторыі заходнебеларускіх зямель практычна не праводзілася. Вядучымі галінамі заходнебеларускай

прамысловасці былі лясная, харчовая, мінеральная і тэкстыльная. Значную частку таварнай прадукцыі пастаўлялі на рынак дробныя прадпрыемствы. На тэрыторыі Заходняй Беларусі не было цяжкай прамысловасці і амаль поўнасцю адсутнічалі буйныя прадпрыемствы.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 07.12.2021 г.*

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Броўкін, Я.А. Эканоміка Польшчы ў 1921–1929 гг. / Я.А. Броўкін // Беларус. гіст. часоп. – 1997. – № 3. – С. 25–31.
2. Mały rocznik statystyczny 1931 / Gł. Urząd Statyst. Rzeczypospolitej Polskiej. – Warszawa: Nakł. Gł. Urzędu Statyst., 1931. – 168 s.
3. Нестерович, Н.Б. Характер западнобелорусской экономики в 1921–1939 гг. / Н.Б. Нестерович // Заходні рэгіён Беларусі вачыма гісторыкаў і краязнаўцаў: зб. навук. арт. / Ін-т гісторыі НАН Беларусі, Гродзен. дзярж. ун-т; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.]. – Гродна, 2006. – С. 228–232.
4. Jackowski, A. Przemysł w Polsce po wojnie europejskiej. Szkic ekonomiczno-statystyczny / A. Jackowski. – Warszawa: Nakładem Spółki Wydawniczej „Rzeczpospolita", 1920. – 15 s.
5. Абрамов, А. Западная Украина и Западная Белоруссия: ист. очерк / А. Абрамов, К. Венский. – М.: Газ.-журн. и кн. изд-во Ленингр. гор. совета депутатов трудящихся, 1940. – 52 с.
6. Наркевич, С.И. Промышленность Западной Белоруссии в период белопольской оккупации (1920–1939 гг.): автореф. дис. ... канд. экон. наук: ? / С.И. Наркевич; Акад. наук БССР. – Минск, 1965. – 20 с.
7. Сямёнчык, М.Б. Рабочы рух у Заходняй Беларусі (1921–1939): аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук: 07.00.02 / М.Б. Сямёнчык; Ін-т гісторыі НАН Беларусі. – Мінск, 2000. – 16 с.
8. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБр). – Ф. 1. Воп. 1. Спр. 758.
9. Наркевіч, С.І. Дзяржаўна-манапалістычны капіталізм у прамысловасці Заходняй Беларусі 1920–1939 гг. / С.І. Наркевіч // Вес. акад. навук БССР. Сер. грам. навук. – 1964. – № 4. – С. 59–66.
10. Фришман, В. Промышленность Западной Белоруссии = The industry of western White-Russia: стат.-экон. описание / В. Фришман. – Минск: Изд-во Белорус. акад. наук, 1934. – 133 с.
11. Mały rocznik statystyczny 1936 / Gł. Urząd Statyst. Rzeczypospolitej Polskiej. – Warszawa: Nakł. Gł. Urzędu Statyst., 1936. – 310 s.
12. Polski przemysł i handel: księga adresowa i informacyjna przebsiębiorstw przemysłowych, handlowych i finansowych w Rzeczypospolitej Polskiej / Izba Przemysłowo-Handlowa. – Warszawa, 1930. – 1156 s.
13. Ziemie polnocno-wschodnie Rzeczypospolitej / red. J. Swiecicki. – Wilno: Kresowa Druk., 1933. – 68 s.
14. Nagurski, T. Przemysł i handel w Wileńskiem i Nowogródzkiem / T. Nagurski. – Wilno [etc.]: Księgarnia św. Wojciecha, 1934. – 64 s. – (Bibljoteczka Poradni Dydaktyczno-Wychowawczej przy Kuratorjum Okręgu Szkolnego Wileńskiego: pomoc dla nauczyciela realizującego program publicznej szkoły powszechnej. Ser. 2; № 2–3).
15. Lietuvos Centrinis Valstybinis Archyvas (LCVA). – F. 51. Ap. 6. B. 255.
16. Sprawozdanie o stanie gospodarczym okręgu Izby przemysłowo-handlowej w Wilnie w roku 1935 / Izba Przemysłowo-Handlowa. – Wilno, 1936. – 244 s.
17. ДАБр. – Ф. 1. Воп. 3. Спр. 912.
18. LCVA. – F. 51. Ap. 6. B. 370.
19. ДАБр. – Ф. 1. Воп. 1. Спр. 692.
20. LCVA. – F. 51. Ap. 6. B. 284.
21. Stan przemysłu na terenie Województwa Nowogródzkiego. Możliwości i drogi ego rozwoju // Życie Nowogródzkie. – 1928. – T. 93. – S. 2.
22. Шнейдер, Я. Очерк размещения промышленности Западной Белоруссии / Я. Шнейдер. – Минск: Изд-во Акад. наук БССР, 1936. – 104 с.
23. Занальны дзяржаўны архіў у г. Маладзечне (ЗДАМ). – Ф. 2. Воп. 1. Спр. 11.
24. Archiwum Akt Nowych w Warszawie (AAN). – Zesp. 12. Ministerstwo Przemysłu i Handlu w Warszawie 1918–1939. Sygn. 97.
25. Sprawozdanie o stanie gospodarczym okręgu Izby przemysłowo-handlowej w Wilnie w roku 1937 / Izba Przemysłowo-Handlowa. – Wilno, 1938. – 200 s.
26. ДАБр. – Ф. 1. Воп. 5. Спр. 799.
27. ДАБр. – Ф. 1. Воп. 1. Спр. 702.
28. Stan przemysłu na terenie Województwa Nowogródzkiego. Możliwości i drogi ego rozwoju // Życie Nowogródzkie. – 1928. – T. 95. – S. 2.
29. LCVA. – F. 51. Ap. 6. B. 255.
30. LCVA. – F. 51. Ap. 6. B. 314.
31. ДАБр. – Ф. 1. Воп. 1. Спр. 726.
32. LCVA. – F. 51. Ap. 6. B. 269.